ISSN 0321-1649 (print)
УДК [94(476)+[323.311+342.5](476)(091)],„1733”

Пастуліў у рэдакцыю 20.12.2016
Received 20.12.2016

**А. У. Мацук**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАЗІЦЫІ ПЕРАДКАНВАКАЦЫЙНЫХ СОЙМІКАЎ ВКЛ У 1733 г.

Статья посвящена исследованию позиции поветовых передконвокационных сеймиков ВКЛ в вопросе выбора короля в 1733 г. Цель статьи – установление позиции передконвокационных сеймиков ВКЛ по основным политическим вопросам, а именно насчет кандидатуры будущего монарха. Рассмотрение этой проблемы стало возможным после выявления нового собрания инструкций послам с передконвокационных сеймиков ВКЛ в архиве Коссовских из Глоговы в Государственном архиве Польши в Лодзи. Из 24 посольских инструкций послам на конвокационный сейм 1733 г. нам известно 18. На их основании удалось установить, что шляхта на 13 передконвокационных сеймиках ВКЛ высказалась за избрание будущим королем “пяста”. Фактически это означало поддержку кандидатуры Станислава Лещинского, который и был основным кандидатом “пястом”. В его поддержку выступило большинство поветовых передконвокационных сеймиков 1733 г.

На оставшихся 5 передконвокационных сеймиках шляхта не высказалась за избрание будущим королем “пяста”. Среди этих сеймиков были новогрудский и минский, которые в будущем станут центрами оппозиции Станиславу Лещинскому. Это показывает, что противники Лещинского имели большинство уже на передконвокационных сеймиках этих поветов.

Многие передконвокационные сеймики занялись вопросом отмены налога подымного со шляхты ВКЛ. Отменить этот налог в своих инструкциях просила лидская, трокская, гродненская, ковенская, жмудская, минская и часть мстиславской шляхты, а брестская шляхта специально для урегулирования этого вопроса выслала своих послов к примасу Теодору Потоцкому. В посольские инструкции также попали партикулярные просьбы различных магнатов Речи Посполитой: Радзивиллов, Теодора Любомирского и Якуба Собесского.

*Ключевые слова:* сеймики, конвокационный сейм, шляхта, магнаты, бескоролевье 1733–1735 гг., сеймовые послы, “пяст”, король, Станислав I Лещинский, конфедерация.

**A. V. Matsuk**

*Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## POLITICAL STANDPOINTS OF THE PRE-CONVOCATION SEJMIKS IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN 1733

The article investigates the position of pre-convocation povet sejmiks in the Grand Duchy of Lithuania regarding the selection of the king in 1733. The aim of the article is to establish the position of pre-convocation sejmiks in the Grand Duchy of Lithuania on major political issues and first of all on the candidature of the future monarch. It became possible to address this issue after a new collection of instructions to delegates from pre-convocation sejmiks of the Grand Duchy of Lithuania was found in the archive kept by the Kossowskie of Glogow in the Polish State Archives in Lodz. Of 24 instructions to delegates of the 1733 convocation sejm, we know 18. It was found on their basis that the Szlachta at the 13 pre-convocation sejmiks in the Grand Duchy of Lithuania spoke in favor of electing a “piast” as the future king. That actually meant supporting the candidacy of Stanislaw Leszczynski who was the leading “piast” candidate. The majority of pre-convocation povet sejmiks in 1733 supported him.

At the remaining 5 pre-convocation sejmiks, the Szlachta did not support the election of a “piast” as the future king. Among these were Novogrudok and Minsk sejmiks. Later they will become centers of opposition to Stanislaw Leszczynski. This shows that Leszczynski’s opponents already formed the majority at pre-convocation sejmiks in these povets.

Many pre-convocation sejmiks addressed the issue of abolishing the real estate tax imposed on the Szlachta of the Grand Duchy of Lithuania. The Szlachta of Lida, Troki, Grodno, Kovno, Zhmud, Minsk and, partially, of Mstislav requested to abolish this tax in their instructions; the Szhlachta of Brest even sent their ambassadors to the Primate, Teodor Potocki specifically on this question. Also the instructions to the delegates included particularistic requests from various noblemen of the Polish-Lithuanian Commonwealth: the Radzivils, Teodor Liubomirski and Jakub Sobieski.

*Keywords:* sejmiks, Convocation Sejm, Szlachta, nobility, Interrex 1733–1735, sejm delegates, “piast,” king, Stanislaw I Leszczynski, Confederation.

**Уводзіны.** Бескаралеўе 1733–1735 гг. у Рэчы Паспалітай з’яўлялася тэмай ужо не адной гістарычнай працы. Адной з ключавых падзей гэтага бескаралеўя былі пастановы канвакацыйнага сойма: аб выключэнні іншаземцаў з ліку кандыдатаў на трон і аб выбары будучым каралём “пяста і каталіка”. Гэтыя рашэнні былі прыняты па ініцыятыве прыхільнікаў аднаго з прэтэн-

© Мацук А. У., 2017

дэнтаў на трон Станіслава Ляшчынскага на чале з прымасам Тэадорам Патоцкім. Яны знайшлі вялікую падтрымку сярод шляхты на перадканвакацыйных сойміках Рэчы Паспалітай і таму былі паспяхова рэалізаваны на канвакацыйным сойме. Праблема перадканвакацыйных соймікаў 1733 г. ужо шмат разоў з'яўлялася прадметам розных даследаванняў [1–8]. Аднак толькі нязначная іх частка прысвечана пазіцыі перадканвакацыйных соймікаў ВКЛ. Перадканвакацыйныя соймікі ВКЛ уяўляюць значны інтарэс з улікам таго, што пазней менавіта ў Княстве праявілася апазіцыя кандыдатуры Станіслава Ляшчынскага. Акрамя таго, якраз надышла чарга паслу з ВКЛ з'яўляцца маршалкам канвакацыйнага сойма. У такім выпадку барацьба на перадканвакацыйных сойміках ВКЛ была першым этапам змагання за ўрад маршалка сойма.

У адным з сваіх ранейшых артыкулаў мне ўжо прыходзілася даследаваць перадканвакацыйныя соймікі ВКЛ у кантэксце палітычнай барацьбы ў Княстве ў пачатку бескаралеўя 1733 г. [9]. За мінулыя з таго часу гады ўдалося выявіць новыя інструкцыі паслам з павятовых перадканвакацыйных соймікаў ВКЛ, што дае магчымасць рэканструяваць пазіцыю адносна будучага манарха амаль усіх павятовых соймікаў ВКЛ. Гэта стала магчыма, у першую чаргу, дзякуючы падказцы вядомага польскага даследчыка Анджэя Рахубы. Менавіта ён звярнуў маю ўвагу на вялікі збор інструкцый з перадканвакацыйных соймікаў ВКЛ у архіве Касоўскіх з Глаговы ў Дзяржаўным архіве ў Лодзі. Яны патрапілі сюды пасля Антонія Касоўскага, які быў рэгентам канцылярыі падканцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага. Таму захоўванне такой значнай колькасці пасольскіх інструкцый у гэтым архіве тлумачыцца тым, што яны збіраліся для інфармацыі лідарам Фаміліі[1]. Захоўваліся гэтыя дакументы ў Антонія Касоўскага.

Мэтай артыкула з'яўляецца ўстанаўленне пазіцыі перадканвакацыйных соймікаў ВКЛ па асноўных палітычных пытаннях, а галоўнае – наконт кандыдатуры будучага манарха.

**Асноўная частка.** Пачатак бескаралеўя прынёс нечаканы саюз паміж двума галоўнымі варагуючымі групоўкамі ў Рэчы Паспалітай: Патоцкімі і Чартарыйскімі. Абедзве групоўкі аб'ядналіся вакол кандыдатуры на трон Станіслава Ляшчынскага. На карысць Ляшчынскага сведчыла тое, што на яго баку быў кіруючы ў бескаралеўе ўрадам прымас Тэадор Патоцкі. Як кіраўнік урада ён склікаў сваім універсалам перадканвакацыйныя соймікі. Яго інструкцыя на соймікі складалася з 17 пунктаў. Сярод іх былі наступныя:

аб'явіць ворагам тых, хто насуперак праву абвесціць каго каралём;

калі хто пачне збіраць войска не па загаду Рэчы Паспалітай, то рэгіментарыі павінны былі паступіць з такім па ўсёй строгасці закона;

гродскія старосты павінны былі абараняць шляхту ад нападзенняў, а нападаючых дастаўляць на суд каптуровых судоў;

паставіць у Кракаве гарнізон ад імя Рэчы Паспалітай, а не ад прыватнай асобы, пад якой разумеўся кракаўскі ваявода Тэадор Любамірскі;

не даваць дысідэнтам магчымасці адмяніць пастановы сойма 1717 г. супраць іх;

вызначыць як мага раней тэрмін элекцыйнага сойма;

не адвяргаць папярэдне ні аднаго кандыдата, каб нікога не пакрыўдзіць;

скасаваць пастановы 1717 г. аб наданні ўрада гетманаў толькі на сойме, бо яны прывялі да зрыву некалькіх соймаў [10, s. 18–19; 11, s. 115][2].

Як бачна, пункты былі вытрыманы ў агульных выразах і не змяшчалі спрэчных пытанняў. Зроблена гэта было, каб шляхта прыязна ставілася да іх і падтрымала гэтыя прапановы на перадканвакацыйных сойміках. Пабачыўшы варожае стаўленне шляхты Рэчы Паспалітай да іншаземцаў і дысідэнтаў, прымас вырашае выдаць дадатковыя пяць пунктаў на перадканвакацыйныя соймікі. Па-першае, патрабавалася выключыць з ліку кандыдатаў на трон іншаземных кандыдатаў, асабліва тых, якія былі ўладарамі іншых краін. У такім выпадку ён больш клапаціўся, “як у мінулае панаванне”, за свае ўласныя ўладанні, а не за Рэч Паспалітую. Па-другое, пазбавіць дысідэнтаў усіх урадаў, а асабліва пачмайстраў. Па-трэцяе, усіх падазроных асоб, якія былі звязаны з замежнымі краінамі, патрабавалася выдаліць не толькі з Варшавы, але і з Рэчы Паспалітай.

[1] Магнацкая групоўка роду Чартарыйскіх, іх сваякоў Панятоўскіх.

[2] Расійскі даследчык Гер'е памылкова дае 16 такіх пунктаў. Больш таго, ён вельмі адвольна тлумачыць сэнс гэтых пунктаў [1, с. 161–162].

Па-чацвёртае, замежныя паслы не маглі мець гвардыю, бо прысутнасць іншаземных жаўнераў з'яўлялася падставай да канфліктаў у Варшаве. Па-пятае, шляхце забаранялася ўжываць іншаземныя экзатычныя тытулы, паколькі гэта супярэчыла шляхецкай роўнасці [10, s. 19–20; 11, s. 115–116].

Перадканвакацыйныя соймікі ў ВКЛ прайшлі 18 сакавіка 1733 г. На іх галоўным чынам паміж сабой змагаліся прыхільнікі некалькіх магнацкіх груповак: Чартарыйскіх, Радзівілаў, Сапегаў, Агінскіх. На віленскім сойміку пад дырэкцыяй Мікалая Петрусевіча былі абраны пасламі на сойм Рэчы Паспалітай віленскі харужы Бенедыкт Ян Вольскі і віленскі падваявода Ян Гараін. Віленская шляхта жадала, каб рэгіментарый ВКЛ, як кіраўнік войску, выправадзіў з межаў Рэчы Паспалітай усіх тых, хто хоча перашкодзіць выбару будучага караля. Ад рэгіментарыяў патрабавалася не ўмешвацца ў соймы, а пільнаваць межы дзяржавы. Акрамя таго, яны павінны былі не даваць афіцэрскія чыны дысідэнтам. Віленская шляхта патрабавала, каб канвакацыйны сойм не быў ператвораны ў элекцыйны. Тэрмін апошняга планавалася вызначыць на бліжэйшы час, не пазней канца жніўня 1733 г. Адносна будучага кандыдата на трон патрабавалася, каб ён папярэдне да элекцыйнага сойма заявіў аб сваім старанні аб кароне. Віленская шляхта патрабавала, каб на сойме задаволілі прэтэнзіі Любамірскіх і Сангушкаў адносна капальні солі Кунегунда, якая была забрана ў Скарб Рэчы Паспалітай. Праўда, гэта павінна было быць зроблена ўжо на звычайным сойме пасля выбараў будучага манарха. Прасіла віленская шляхта вырашыць на карысць Радзівілаў справу прыналежнасці ключоў Кіявец і Мялейчыцы, якія былі прызнаны дзяржаўнай уласнасцю і далучаны да Брэсцкай эканоміі. Віленская шляхта патрабавала, каб Рэч Паспалітая выплаціла свае даўгі каралевічу Якубу Сабескаму. Яна была катэгарычна, што будучым каралём павінен быць абраны толькі жыхар Рэчы Паспалітай, які нарадзіўся ў Кароне ці Княстве [12, p. 157–163, 164–167v; 13, p. 31; 14, k. 7–8; 15, л. 66]. Такой фармулёўкай з кандыдатаў на трон выдаляўся сын Аўгуста II саксонскі курфюрст Фрыдрых Аўгуст, які нарадзіўся па-за межамі Рэчы Паспалітай.

У Лідзе пад дырэкцыяй лідскага маршалка Казіміра Сцыпіона дэль Кампа пасламі былі абраны вілейскі староста Пётр Пац і прыхільнік Фаміліі лідскі гродскі староста Юзаф Сцыпіон дэль Кампа. Мясцовая шляхта хацела, каб з ліку кандыдатаў былі выключаны замежныя кандыдаты. Лідская шляхта патрабавала, каб канвакацыйны сойм супрацьпраўна не займаўся справамі элекцыі (выбараў) караля. Асабліва падкрэслівалася, што канвакацыйны сойм не павінен вызначаць, як рухацца паветам на элекцыйны сойм – усёй шляхтай (паспалітым рушэннем) ці толькі вызначанымі дэлегатамі. Шляхта прасіла адмяніць падатак падымнага для шляхты ВКЛ. Мясцовыя шляхціцы выступалі за павелічэнне колькасці войску, але толькі ў выпадку, калі падаткі на гэта не будуць брацца з земскіх уладанняў. Прагучала патрабаванне аб абмежаванні дысідэнтам займаць урады і з'яўляцца афіцэрамі ў войску. У інструкцыі былі змешчаны пункт аб вырашэнні прэтэнзій Радзівілаў да ключоў Кіявец і Мялейчыцы, а таксама патрабаванне кампенсацыі для каралевіча Якуба Сабескага за даўгі, зробленыя Рэччу Паспалітай і Аўгустам II [16, p. 1–2].

З захаваўшыхся "галоўных пунктаў" вількамірскіх паслоў (пералічана 8 пунктаў) на канвакацыйны сойм вядома, што мясцовая шляхта выступіла ў падтрымку выбару будучым каралём "пяста" і каталіка, калі на гэта будзе згода ўсіх прысутных. Больш таго, яна патрабавала стварыць канфедэрацыю, якая забароніць старацца аб кароне іншаземцу. Пасля гэтага ішаземцы нават не мелі права прапаноўваць сваю кандыдатуру на выбар каралём на элекцыйным сойме Рэчы Паспалітай. У выпадку, калі з кандыдатурай "пяста" не ўсе прысутныя будуць згодны, а яго выбар пацягне за сабой спрэчкі і не будзе мець добрых наступстваў для Рэчы Паспалітай, то, наадварот, прапаноўвалася ўжо з дапамогай канфедэрацыі выключыць з ліку кандыдатаў мясцовых жыхароў. Тых, хто з "пястаў" не згадзіцца на гэта і будзе прэтэндаваць на карону, прапаноўвалася лічыць "ворагам Айчыны". Абраць у такім выпадку планавалася іншаземца. Вількамірская шляхта патрабавала, каб канвакацыйны сойм не ператварыўся ў элекцыйны, а ў каралеўскіх выбарах прыняла ўдзел уся шляхта, якая пажадае. Мясцовая шляхта хацела, каб рэгіментарыі войск былі апісаны ў сваіх прэрагатывах як гетманы пастановамі сойма 1717 г. Гэта, безумоўна, быў пункт, накіраваны супраць Станіслава Панятоўскага і Міхала Вішнявецкага, якія з'яўляліся генеральнымі рэгементарыямі ў Кароне і Княстве. Прапаноўвалася скасаваць ранейшае рашэнне

аб прызначэнні гетманаў толькі на сойме, бо з-за барацьбы магнатаў за гэты ўрад зрываліся соймы. Кароль сам меў права вызначыць, калі надаваць гэтыя ўрады, але каронную булаву мог даваць толькі жыхарам Кароны, а літоўскую – Княства. Вількамірская шляхта прасіла даваць адной асобе не больш за два староствы і каралеўшчыны. Калі кароль даваў адной асобе іх больш, то ўжо забаранялася канцлеру і падканцлеру зацвярджаць пячаткай такія каралеўскія рашэнні [17, k. 1–3].

На троцкім сойміку пад дырэкцыяй троцкага войскага і троцкага гродскага суддзі Стэфана Ромера пасламі былі абраны троцкі цівун і троцкі падваявода Казімір Юзаф Укольскі і выконваючы абавязкі троцкага харужага троцкі земскі пісар і віленскі гараднічы Андрэй Юзаф Таруса. У інструкцыі сваім паслам на сойм троцкая шляхта прасіла, каб на канвакацыйным сойме не было вызначана, як шляхта будзе прысутнічаць на элекцыйным сойме: усе жадаючыя ці толькі абраныя паслы. Яна патрабавала, каб ніякіх перамен у правядзенні канвакацыйнага сойма не было зроблена. Фактычна яна апасалася сітуацыі, калі канвакацыйны сойм быў бы пераўтвораны ў канфедэрацыю, якая прывяла б да выбараў новага манарха. Троцкая шляхта патрабавала, каб ні ў якім разе на канвакацыйным сойме не была выключана з ліку прэтэндэнтаў кандыдатура “пяста”. Троцкая шляхта жадала адмены падымнага. Узгадваліся ў інструкцыі і інтарэсы каралевіча Якуба Сабескага ў вяртанні яму даўгоў ад Рэчы Паспалітай [18, p. 605–608]. Супраць троцкага сойміка 38 мясцовых шляхціцаў занеслі пратэстацыю, якая не перашкодзіла прызнаць законным выбар троцкіх паслоў на канвакацыйным сойме [12, p. 168–169 v].

На гродзенскім сойміку пад дырэкцыяй мсціслаўскага кашталяна Самуэля Лазавога пасламі былі абраны гродзенскі гродскі староста Міхал Масальскі і гродзенскі харужыц Юзаф Вал. У іх інструкцыі на сойм патрабавалася, каб на трон Рэчы Паспалітай “быў абраны той жа дзяржавы жыхар”. Фактычна такім спосабам з ліку кандыдатаў на трон выключаліся замежныя прэтэндэнты. Гродзенская шляхта хацела, каб на элекцыйны сойм маглі прыбыць усе жадаючыя шляхціцы. Мясцовая шляхта катэгарычна патрабавала адмяніць падымны падатак: “ніякім спосабам больш плаціць ня хочам, не абяцаем і ня будзем”. Плату для войску ў такім выпадку прапаноўвалася спагнаць са староstваў. Шляхта патрабавала выплаты кампенсацыі каралевічу Якубу Сабескаму і вяртання Радзівілам ключоў Кіявец і Мялейчыцы [20, арк. 108–109 адв., 110–111; 21, p. 1–2; 22, к. 97].

На ковенскім сойміку пасламі былі абраны ковенскі абозны Шымон Сіруць і ковенскі падчашы Антоній Забела. Згодна з інструкцыяй ковенскім паслам на сойм Рэчы Паспалітай каралём павінен быць абраны толькі жыхар Рэчы Паспалітай. Ковенская шляхта патрабавала, каб канвакацыйны сойм не быў злучаны з элекцыйным. Мясцовая шляхта хацела, каб элекцыйны сойм адбыўся не пазней сярэдзіны жніўня ці 1 верасня 1733 г., і ўсе жадаючыя шляхціцы прымалі ў ім удзел. Шляхта планавала выключыць з ліку кандыдатаў іншаземцаў, а калі гэта не будзе зроблена, то сярод усіх кандыдатаў абраць каралём абавязкова “народжанага паляка”. Ковенская шляхта патрабавала скасаваць падатак падымнага для ВКЛ, а на соймах былі вызначаны іншыя шляхі фінансавання войску. Асаблівую незадаволенасць мясцовай шляхты выклікала наданне ўрадаў у ВКЛ жыхарам Кароны, а таксама накіраванне “каранняжаў” у пасольствы ў Швецыю і Расію. У гэтыя пасольствы не патрапіў ніводны літвін, і таму ковенская шляхта патрабавала не фінансаваць іх са Скарбу ВКЛ. Шмат месца ў інструкцыі адводзілася засіллю іншаземных афіцэраў у войску ВКЛ. Паслы клапаціліся ў рэгіментарыя ВКЛ аб звальненні іншаземцаў з войску. Акрамя таго, рэгіментарыі Кароны і Княства, на думку ковенскай шляхты, падчас бескаралеўя з войскам павінны пільнаваць межы Рэчы Паспалітай [15, л. 59 отв.; 22, k. 1–4].

На ўпіцкім сойміку пасламі былі абраны ўпіцкі маршалак Міхал Корсак і ўпіцкі земскі суддзя Павал Францішак Марцінкевіч. Павятовым палкоўнікам быў абраны ўпіцкі гродскі староста Антоній Пузына [23, p. 959–959 v; 24, p. 328–331]. У іх інструкцыі змяшчалася пастанова, каб будучым каралём быў абраны толькі “пяст”. Шмат месца ў пасольскай інструкцыі адводзілася тлумачэнню гэтага пункта. Прыводзіліся няўдалыя прыклады выключэння кандыдатуры “пяста” і выбару іншаземца. Галоўнымі перавагамі кандыдата-“пяста” называлася веданне мовы і правоў Рэчы Паспалітай. Патрабавалася не парушаць правоў вольнага выбару караля. Мясцовая шляхта прасіла захаваць спакой з суседзямі [15, л. 59 отв., 24, p. 328–331].

Шляхта Жмудскага княства абрала паслamі на канвакацыйны сойм скарбнага ВКЛ і батоцкага старосту Яна Адахоўскага і эйрагольскага цівуна Францішка Карпа. Жмудская шляхта патрабавала, каб канвакацыйны сойм ні ў якім разе не быў ператвораны ў элекцыйны. Паветы і ваяводства планавалі прыбыць на элекцыйны сойм “старадаўнім звычаем”. Што датычыцца кандыдатуры будучага караля, то жмудская шляхта хацела выбраць “набожнага, мудрага, на вайну і помсту нясквапнага”. Шляхта катэгарычна забараняла любую наступальную вайну. Рэгіментарыі і гродскія старосты павінны былі пільнаваць межы дзяржавы ад магчымага замежнага ўмяшання. Жмудская шляхта пагаджалася на павелічэнне колькасці войску, але з умовай, што падаткі з яго не плануюцца з земскіх уладанняў. Больш таго, мясцовая шляхта выступала за скасаванне падымнага з земскіх уладанняў [25, k. 1–5].

Вядомы абедзве інструкцыі эгзулянцкіх соймікаў. На смаленскім сойміку пасламі былі абраны смаленскі падваявода Антоні Аляксандр Гансеўскі і інстыгатар ВКЛ Станіслаў Бужыньскі [13, p. 31]. Смаленская шляхта планавала выключыць з ліку кандыдатаў замежных канкурэнтаў і абраць мясцовага жыхара і каталіка па веравызнанні. Прычынай была ранейшая гісторыя, калі з-за замежных кандыдатаў Рэч Паспалітая атрымала значныя шкоды. Войска павінна пільнаваць межы Рэчы Паспалітай падчас каралеўскіх выбараў. Што датычыцца выбару караля, то патрабавалася, каб удзел у ім прымала ўся шляхта, якая пажадае, а не спецыяльна вызначаныя дэлегаты. Смаленская шляхта прасіла кампенсаваць каралевічу Якубу Сабескаму даўгі Рэчы Паспалітай яго бацьку каралю Яну III Сабескаму. Шляхта патрабавала вяртання саляной капальні Кунегунды Сангушкам і Любамірскім, а таксама абяцала “садзейнічаць” інтарэсам канцлярыны ВКЛ Ганны з Сангушкаў Радзівіл (з вялікай доляй верагоднасці можна меркаваць, што размова ідзе пра вяртанне Кіяўца і Мялейчыц) [26, k. 1–3].

На старадубскім сойміку пасламі былі абраны старадубскі гродскі староста Ян Жаба і брэсцкі ваяводзіц Казімір Сапега. Апошні з’яўляўся прадстаўніком коданьскай галіны Сапегаў, але, напэўна, дзейнічаў у інтарэсах сваіх родзічаў з ружанскай галіны роду Сапегаў, бо яго выбар адбыўся толькі дзякуючы генералу артылерыі Казіміру Лявону Сапегу [13, p. 31]. Мясцовая шляхта патрабавала абраць будучым каралём толькі жыхара Рэчы Паспалітай. Страдубская шляхта прасіла, каб канвакацыйны сойм не ўмяшаўся ў прэрагатывы элекцыйнага сойма. Час элекцыі меў быць прызначаны “як мага хутчэй”. Да таго ж, шляхта хацела кампенсаваць доўг, які меўся перад каралевічам Якубам Сабескім. Таксама неабходна была кампенсацыя Любамірскім і Сангушкам за капальню солі Кунегунда. Старадубская шляхта прасіла вярнуць Радзівілам забраныя ў іх эканамічныя ўладанні Кіявец і Мялейчыцы. З-за магчымай пагрозы суседзяў і каб іх не засталі знянацку ў выпадку нападзення, старадубская шляхта меркавала прасіць прымаса выдаць “віці” (каралеўскія ўніверсалы на скліканне паспалітага рушэння). Праўда, перад гэтым планавалася абмеркаваць гэтае пытанне з генеральным рэгіментарыем ВКЛ Міхалам Вішнявецкім, бо “асцярожнасць ёсць матка бяспекі” [27, л. 1–6]. Вядома, што на гэтым сойміку чыталі ліст Міхала Казіміра Радзівіла да мясцовай шляхты. Гэты ліст чытаў полацкі кашталян Валяр’ян Жаба, які ўпэўніваў у прыхільнасці Радзівілам старадубскіх паслоў [28, k. 40–41]. Увогуле Жабы падтрымлівалі Радзівілаў і паведамлялі, што прыхільныя ім пункты былі ўключаны ва ўсе тры інструкцыі соймікаў, якія адбываліся ў Вільні: віленскі, смаленскі і старадубскі [28, k. 40–41].

На наваградскім сойміку пасламі былі абраны канюшы ВКЛ Удальрык Радзівіл і наваградскі стольнік Ян Храптовіч. У інструкцыі наваградскіх паслоў на сойм Рэчы Паспалітай змяшчалася патрабаванне наваградскай шляхты, каб канвакацыйны сойм не быў ператвораны ў элекцыйны сойм. Акрамя таго, наваградская шляхта хацела, каб на элекцыйным сойме караля выбірала ўся шляхта, а не спецыяльна вызначаныя ад ваяводстваў дэлегаты. Час правядзення элекцыйнага сойма прапаноўваўся каля дня Святога Міхала (29 верасня). Патрабавалася выдаліць іншаземцаў з войску і паменшыць колькасць афіцэраў. Таксама мясцовая шляхта хацела пацвердзіць правы дысідэнтаў згодна з пастановай сойма 1717 г. Як вядома, гэтыя пастановы сойма 1717 г. значна абмяжоўвалі правы дысідэнтаў. Таму гэты пункт неабходна прызнаць варожым для дысідэнтаў. Наваградская шляхта пагаджалася на павелічэнне войску, але толькі не за кошт падаткаў з земскіх уладанняў. Мясцовая шляхта катэгарычна выступала, каб урады ў Княстве надаваліся толькі літвінам, а ў Кароне – палякам. Забаранялася даваць ротмістраўства ў кампутовых харугвах татарам, а трэба было даваць іх шляхце [29, арк. 393–394 адв., 395–396 адв., 398–400 адв.][3].

[3] Падрабязней аб наваградскім сойміку гл. [30].

У Слоніме на сойміку адбыліся значныя спрэчкі паміж прыхільнікамі Сапегаў і Чартарыйскіх. Соймік удалося выратаваць, ператварыўшы яго ў канфедэрацкі “на аснове практыкаваных падчас бескаралеўя, звычаяў і навукі айчыннага права” [31, арк. 98 адв.]. Гэта права заключалася ў тым, што з “даўніх часоў звычай быў, што падчас бескаралеўя, калі перадканвакацыйны соймік быў сарваны, тады абы канфедэрацкім скончаўся” [13, p. 38 v]. Маршалкам канфедэрацыі быў абраны слонімскі войскі і слонімскі падстароста Андрэй Міхал Булгак, а пасламі на канвакацыйны сойм – мерацкі староста Антоні Казімір Сапега і крэўскі староста Міхал Слізень. У іх інструкцыі прапаноўвалася, каб час элекцыйнага сойма быў вызначаны на верасень. Патрабавалася, каб будучым каралём быў абраны жыхар Рэчы Паспалітай, а не замежны кандыдат. Адносна Кракава шляхта хацела, каб кіраванне ім ажыццяўлялася згодна са старадаўнім правам. Такой размытай фармулёўкай задавальняўся як кракаўскі ваявода Тэадор Любамірскі, людзі якога занялі замак, так і каронны рэгіментарый Станіслаў Панятоўскі, які з дапамогай жаўнераў планаваў заняць замак ад імя ўлад Рэчы Паспалітай. Слонімская шляхта хацела, каб харугвы, якія кім-небудзь набіраліся, былі знішчаны войскам пад кіраўніцтвам генеральнага рэгіментарыя. Мясцовая шляхта прасіла і кампенсацыю Радзівілам за адабраныя ключы Кіявец і Мялейчыцы (належалі Брэсцкай эканоміі). Слонімская шляхта хацела аднаўлення перадсоймавага з’езда шляхты ВКЛ у Слоніме. Акрамя паслоў на сойм слонімская шляхта абрала паслоў да генеральнага рэгіментарыя ВКЛ Міхала Вішнявецкага – слонімскага гродскага суддзю і слонімскага каптуровага суддзю Казіміра Тавяньскага і слонімскага скарбніка Францішка Брадоўскага [31, арк. 88–89 адв., 97–102 адв.]. Пратэстуючы супраць слонімскага перадканвакацыйнага сойміка, слонімскі стражнік Ігнат Ланеўскі Воўк з іншымі сваімі прыхільнікамі выступіў супраць ператварэння сойміка ў канфедэрацкі. Супраць слонімскай канфедэрацыі быў пададзены маніфест і адначасова акт рэканфедэрацыі. Частка слонімскай шляхты пратэставала супраць мясцовых ураднікаў, якія яшчэ падчас грамнічнага і гаспадарскага соймікаў правялі нелегальны, на іх думку, з-за смерці Аўгуста ІІ выбар земскіх ураднікаў. Асабліва мясцовая шляхта пратэставала супраць прызначанага харужага Марціна Палубінскага. Шляхта занесла супраць яго і пратэстацыю, як на перадканвакацыйным сойміку, але гэтую пратэстацыю не ўлічылі, бо соймік быў ператвораны ў канфедэрацыю. Тады шляхта пратэставала супраць такой незаконнай канфедэрацыі, яе маршалка, паслоў на канвакацыйны сойм і каптуровага суда. У выніку пратэстуючая шляхта заявіла аб стварэнні рэканфедэрацыі. Пад гэтым маніфестам падпісаліся 96 шляхціцаў на чале з слонімскім стражнікам Ігнатам Ланеўскім Ваўком і слонімскім падчашым Янам Багдановічам [29, арк. 378–379 адв.]. Зразумела, што стварэнне рэканфедэрацыі было зроблена прыхільнікамі Фаміліі, якія не хацелі дапусціць, каб паслом абралі Антонія Казіміра Сапегу, бо той быў найбольш верагодны кандыдат на пасаду маршалка канвакацыйнага сойма.

З Брэсцкага ваяводства ўдалося знайсці абедзве (брэсцкую і пінскую) інструкцыі паслам на канвакацыйны сойм. На брэсцкім сойміку пад дырэкцыяй брэсцкага стольніка Міхала Сузіна былі абраны 4 паслы: польны пісар ВКЛ Караль Сапега, брэсцкі абозны Пётр Верашчака, інаўроцлаўскі староста Юзаф Данбскі, брэсцкі чашнік Юзаф Гарноўскі. Брэсцкая шляхта сцвярджала, што абрала чатырох паслоў, як на мінулых перадканвакацыйных сойміках [32, арк. 1602, 1624; 33, с. 4 66; 34, л. 1–3]. Напэўна, брэсцкія кандыдаты пагадзіліся паміж сабою і пасламі засталіся два з іх – інаўроцлаўскі староста Данбскі і пісар ВКЛ Сапега. Брэсцкая шляхта патрабавала, каб канвакацыйны сойм не быў ператвораны ў элекцыйны і на трон Рэчы Паспалітай быў абраны “толькі сапраўдны жыхар Рэчы Паспалітай”. Канвакацыйны сойм, на думку брэсцкай шляхты, не павінен прымаць ніякіх пастаноў, якія абмяжоўвалі паветы ў вызначэнні, як рухацца на элекцыйны сойм – усёй шляхце ці толькі дэлегатам. Гэта павінны былі вырашыць перадэлекцыйныя соймікі. Адначасова брэсцкая шляхта патрабавала, каб замежныя паслы за два тыдні да элекцыйнага сойма выехалі з Варшавы. Знаходзіўся ў інструкцыі і пункт на карысць Радзівілаў аб прыняцці пастаноў соймам аб прыналежнасці Радзівілам ключоў Кіявец і Мялейчыцы. Брэсцкая шляхта хацела скасавання лішніх афіцэрскіх ставак і каб афіцэрамі прызначаліся толькі каталікі і жыхары Рэчы Паспалітай. Знаходзіўся ў інструкцыі і пункт супраць Любамірскага аб тым, што кракаўскі замак павінен быць заняты не прыватнай асобай, а ўладамі Рэчы Паспалітай [32, арк. 1624–1627; 33, с. 464–467; 34, л. 1–3]. Калі ўважліва

вывучыць гэтую інструкцыю, то становіцца зразумелым, што адносна кандыдатуры будучага манарха яе можна трактаваць як выключаючую не толькі кандыдатуры замежных кандыдатаў, але і ў першую чаргу кандыдатуру сына Аўгуста II саксонскага курфюрста Фрыдэрыка Аўгуста, які не з'яўляўся "сапраўдным жыхаром" Рэчы Паспалітай. У брэсцкую інструкцыю былі ўключаны прыхільныя Радзівілам пункты, дзякуючы старанням троцкага кашталяна Яна Фрыдэрыка Сапегі. Супраць прарадзівілаўскіх пунктаў выступалі ўплывовыя шляхціцы Хжанстоўскія, асабліва брэсцкі падкаморы Жыгімонт Бенедыкт Хжанстоўскі, але Ян Фрыдэрык Сапега "некалькі разоў у адказ заяўляў: не так будзе, як ваша Міласць Паны хочаце, толькі, як я хачу" [35, k. 7]. Добра ацэньваў брэсцкую інструкцыю і адзін з лідараў магнацкай групоўкі Сапегаў надворны падскарбі ВКЛ Юзаф Францішак Сапега. На яго думку, інструкцыя брэсцкім паслам была складзена "вельмі мудра і прыкладна для іншых" [36, p. 319]. Як можна меркаваць, гэта датычылася пункта аб выбары будучым каралём "толькі сапраўднага жыхара Рэчы Паспалітай".

Справу выбару павятовых палкоўніка, харужага і ротмістраў брэсцкая шляхта адклала да перадэлекцыйнага сойміка. Спецыяльна ў справе адмену падымнага брэсцкая шляхта выслала да прымаса сваіх паслоў гродзенскага чашніка Ваўжынца Эйсманта і Феліцыяна Верашчаку. Былі дасланы паслы і да генеральнага рэгіментарыя ВКЛ Міхала Вішнявецкага: палкоўнік пярэдняй стражы Марцыян Антоній Пашкоўскі і Фларыян Грабоўскі [32, арк. 1601–1607, 1623–1630].

На пінскім сойміку пасламі на сойм Рэчы Паспалітай былі абраны пінскі земскі суддзя Антоній Арэшка і пінскі падчашы Юзаф Кужанецкі. Пінская шляхта больш усяго месца ў інструкцыі вызначыла на апісанне кандыдатуры будучага манарха. Яна падрабязна пералічыла прычыны, па якіх ім не можа быць іншаземец: няведанне законаў, залежнасць ад замежных краін і інш. У такім выпадку магчымым кандыдатам называўся толькі «паляк» і з абодвух бацькоў каталік, які добра ведаў бы правa Рэчы Паспалітай. Такая фармулёўка спецыяльна прапаноўвалася, каб выключыць з ліку кандыдатаў на трон саксонскага курфюрста Фрыдэрыка Аўгуста. Пінская шляхта патрабавала, каб урады ў Княстве надаваліся толькі мясцовым шляхціцам, а не жыхарам Кароны. Мясцовая шляхта хацела, каб іншаземцы не трымалі ў заставе ці арэндзе ніякіх уладанняў. Мясцовая шляхта прасіла, каб адным і тым жа асобам не надавалася некалькі прыбытковых староостваў, акрамя таго, каб гродскія староствы не даваліся непаўналетнім. Рэгіментарыі, па меркаванні пінскай шляхты, павінны былі падчас каралеўскіх выбараў пільнаваць межы Рэчы Паспалітай. Шляхта выступала за вяртанне Радзівілам далучаных да Брэсцкай эканоміі ключоў Кіявец і Мялейчыцы пасля таго, як тыя пакажуць свае дакументы на правa валодання імі. Пасля каралеўскіх выбараў для лепшага разліку выдаткаў пінская шляхта хацела захоўваць падаткі ў паветах. Акрамя таго, выказвалася пажаданне, каб іншаземцы не знаходзіліся ў войску, а асабліва не маглі займаць чыны палкоўніка, обер-лейтэнанта, маёра і капітана [37, арк. 391–394 адв.; 38, k. 1–8].

Віцебская шляхта выступала за выключэнне з ліку кандыдатаў іншаземцаў. Згодна з інструкцыяй віцебская шляхта прызнавала за Радзівіламі ўласнасць Кіяўца і Мялейчыцаў. Акрамя таго, мясцовая шляхта патрабавала вяртання Сангушкам і Любамірскім саляной капальні Кунегунды і кампенсацыі за яе ўтрыманне Рэччу Паспалітай, аб чым соймавыя паслы мелі параіцца з прымасам і сенатарамі. У пытаннях выбараў будучага караля віцебская шляхта хацела, каб галасавала на элекцыйным сойме ўся шляхта ці "як яна сабе пажадае". Рэгіментарыі Кароны і Княства мелі пільнаваць з войскамі межы краіны. Віцебская шляхта хацела, каб ніводная "з каронных і літоўскіх дам на элекцыі ў Варшаве прысутнічаць не рашылася". Шляхта выступала супраць прызначэння любых новых падаткаў. За злоўжыванні на мінулым сойме яго маршалка Юрыя Ажароўскага прапаноўвалася не дапускаць адкрываць пасяджэнні канвакацыйнага сойма. Гэта быў пункт, накіраваны супраць Фаміліі, прыхільнікам якой быў Ажароўскі і па загаду якой ён дзейнічаў на надзвычайным сойме 1733 г. [39, k. 1–10]. Дасланыя Радзівіламі пункты патрапілі ў віцебскую інструкцыю, дзякуючы старанням Казіміра Гуркі. Абраны паслом віцебскі стольнік Павал Багамолец абяцаў служыць інтарэсам Радзівілаў на канвакацыйным сойме [40, k. 1–2, 4–5].

Аршанскі гродскі староста Аляксандр Юзафовіч па ўзгадненні з Сапегамі атрымаў падтрымку іх прыхільнікаў у Аршанскім павеце. У выніку пад дырэкцыяй аршанскага скарбніка і аршанскага падстаросты Міхала Пятроўскага былі абраны пасламі Аляксандр Юзафовіч і аршанскі гродскі пісар Францішак Падбярэскі. Перавагу на сойміку атрымалі прыхільнікі Сапегаў.

Прэтэндуючы на выбар паслом, варожы Сапегам Юзаф Галімскі нават не рашыўся прысутнічаць на сойміку. Адначасова шляхта не дазволіла чытаць на сойміку ліст Міхала Казіміра Радзівіла [41, р. 198–199 v]. У інструкцыі паслам аршанская шляхта патрабавала абавязковага выбару будучым каралём толькі "ўласнага" кандыдата, а не чужаземца. Аршанская шляхта прасіла аб аплаце Любамірскім і Сангушкам за саляную капальню Кунегунду, а таксама аб кампенсацыі каралевічу Якубу Сабескаму. Акрамя таго, інструкцыя змяшчала яўна антырадзівілаўскі пункт аб тым, каб у "нойбургскіх уладаннях" пасэсары, прызначаныя яшчэ ад рэйнскага электара з парушэннем іх правоў, не замяняліся на яўрэяў-арандатараў. Увогуле шмат месца шляхта прысвяціла незаконнасці валодання Радзівіламі "нойбургскімі" ўладаннямі. Асабліва падкрэслівалася, што разам з уласна радзівілаўскімі маёнткамі ў іх рукі патрапіць фактычна трэцяя частка ўладанняў ВКЛ. Адначасова шляхта выступала за вяртанне Радзівілам ключоў Кіявец і Мялейчыцы. З'яўленне гэтага пункта тым больш здаецца дзіўным, калі ўлічыць, што шляхта не дазволіла нават чытаць на сойміку ліст Міхала Казіміра Радзівіла. Магчыма, гэты пункт патрапіў дзякуючы Сапегам, якія супрацоўнічалі ў гэты час з Радзівіламі. Да таго ж, у адрозненне ад справы "нойбургскіх уладанняў" пытанне Кіяўца і Мялейчыц не датычылася Сапегаў і яны маглі паспрыяць у ім Радзівілам. У інструкцыю быў унесены і пункт аб тым, каб у яўрэяў не былі слугамі хрысціяне. Мясцовая шляхта выказвалася за павялічэнне войску, якое меркавалася прафінансаваць з грошай, якія забралі звыш законна вызначаных падскарбіі і гетманы. Мясцовая шляхта змясціла ў інструкцыю і яўна антырасійскія пункты. Так, аршанская шляхта хацела вызвалення з расійскага палону аршанскага земскага суддзі Яна Валяр'яна Лярскага, які незаконна там утрымліваўся. Яна патрабавала, каб пасля смерці курляндскага герцага Курляндыя была далучана да Рэчы Паспалітай і каб ніхто, асабліва "Маскоўская імперыя", не ўмешвалася ў справы гэтага герцагства [42, арк. 13–14 адв., 27–33].

Соймік у Мсціслаўскім ваяводстве падзяліўся на два канкурыруючыя з-за канфлікту прыхільнікаў мясцовыя роды Цеханавецкіх і Валовічаў [43, s. 396–397]. Удалося знайсці толькі некалькі пунктаў інструкцыі мсціслаўскім паслам рэферэндарычу ВКЛ Юрыю Валовічу і смаленскаму чашніку Юзафу Зубу. З іх становіцца вядомым, што прыхільнікі Валовічаў хацелі скасаваць падатак падымнага, а таксама, каб новы кароль вярнуў манетны двор у Рэч Паспалітую з мэтай "біць" тут грошы [44, k. 1–3].

У Мінску пасламі на сойм Рэчы Паспалітай былі абраны сумілiскі староста Станіслаў Юзаф Свянціцкі і бускі земскі пісар Ігнат Казімір Быкоўскі. У інструкцыі мінскіх паслоў на сойм шляхта патрабавала, каб не было ніякіх парушэнняў ранейшых законаў Рэчы Паспалітай і на канвакацыйным сойме вырашаліся пытанні, якія адносяцца да яго кампетэнцыі, акрамя таго, каб канвакацыйны сойм не працягваўся даўжэй за вызначаныя тэрміны. З-за праблем у судаводстве мясцовыя шляхціцы хацелі, каб была праведзена поўная каэквацыя (ураўноўванне) правоў шляхты Княства з шляхтай Кароны. Мінская шляхта пагаджалася абіраць караля любым спосабам "ці як пасля адмовы караля Яна Казіміра, ці звычайна дзейнічала". Як і ў іншых паветах ВКЛ, мінская шляхта хацела скасаваць падымны падатак са шляхты і пагаджалася, каб ён існаваў толькі да элекцыйнага сойма. На замену яго прапаноўвалася збіраць адпаведную гіберну з каралеўшчын. Мінскія шляхціцы прасілі падскарбія ВКЛ разабрацца са злоўжываннямі на мытні. Да яго ж накіроўваўся і іншы пункт інструкцыі па ўстанаўленні справядлівага абменнага курсу. Шляхта патрабавала вяртання ключоў Кіявец і Мялейчыцы нясвіжскім Радзівілам згодна з ранейшым каралеўскім прывілеем. Шляхта хацела, каб яўрэі не мелі права трымаць уладанні і мець у службе хрысціян. Зразумела, такі пункт быў накіраваны на эканомаў-жыдоў, якія прызначаліся нясвіжскімі Радзівіламі. Як бачым, у інструкцыі мінскім паслам не было пункта аб тым, кім павінен быць будучы кароль. Наадварот, у прысязе мінскім паслам быў змешчаны пункт, "нават, каб на той канвакацыі спецыфікацыі кандыдата да той кароны не было, у чым ніякіх угавораў, довадаў ні чыіх не павінны слухаць, не чыіх абяцанняў, прэзентаў не прымалі і імі не далі сябе спакусіцца" [45, арк. 23–25; 46, р. 41–42]. Як можна меркаваць, гэта было невыпадкова. Магчыма, так сталася, бо сярод мінскай шляхты існавала моцная групоўка прыхільнікаў саксонскага курфюрста, і таму пункт аб тым, каб будучым каралём быў толькі "пяст і каталік", не патрапіў у інструкцыю мінскім паслам.

У Мазыры перадканвакацыйны соймік з-за барацьбы варагуючых груповак скончыўся безвынікова [47, с. 76]. 13 красавіка 1733 г. мазырская шляхта сабралася на новы соймік, які быў пераўтвораны ў канфедэрацыю. Пад дырэкцыяй мазырскага скарбніка Мікалая Богушаasламі былі абраны наваградскі кашталяніц Стэфан Аскерка і мазырскі падстароста Юзаф Богуш. У інструкцыі паслам на сойм Рэчы Паспалітай мазырская шляхта заяўляла, што на прошлых каралеўскіх выбарах вялікую шкоду панесла Рэч Паспалітая з-за выключэння з кандыдатаў “пястаў”. Менавіта таму зараз забаранялася выключаць з ліку кандыдатаў “пястаў”. Патрабавалася не ператвараць канвакацыйны сойм у элекцыйны. Мазырская шляхта пагаджалася на павелічэнне войску, але толькі калі падаткі не будуць брацца з земскіх уладанняў. Мясцовая шляхта скрупулёзна пералічвала выпадкі, калі ўрады ў ВКЛ дасталіся “караняжам” (падстолія ВКЛ, лоўчага ВКЛ, смаленскага ваяводы), і патрабавала прызнаць іх вольнымі. Мясцовая шляхта хацела, каб адной асобе не надавалася шмат каралеўшчын. Акрамя таго, патрабавалася, каб былі пацверджаны ранейшыя правы “дысідэнцкай рэлігіі”. У інструкцыі змяшчаліся антырадзівілаўскія пункты ў справе “нойбургскіх уладанняў”. Асаблівую ўвагу мазырская шляхта звяртала на неабходнасць захавання правоў пасэсараў “нойбургскіх уладанняў” і каб цяперашнія пасэсары не парушалі іх правоў. Патрабавалася, каб падкаморыі зверылі межы гэтых уладанняў, бо суседняя з імі шляхта мела вялікія клопаты з новымі пасэсарамі [48, k. 1–8].

Няшмат вядома пра іншыя сойміки. Праўда, з’явілася магчымасць выявіць пастановы трох соймікаў, дзе не ўдалося знайсці інструкцыі паслам, – полацкага, ваўкавыскага і рэчыцкага. На полацкім сойміку пад дырэкцыяй полацкага харужага Аляксандра Канстанціна Корсака пасламі былі абраны полацкі стольнік Юзаф Пакаш і старадубскі гродскі пісар Базылі Корсак [49, арк. 8–8 адв.]. У Ваўкавыску соймік адбыўся ў спакойнай абстаноўцы і пасламі былі абраны ваўкавыскі войскі і ваўкавыскі гродскі пісар Лявон Тулоўскі і ваўкавыскі скарбнік Міхал Сегень. Абрана 4 ротмістры. Інструкцыя была складзена ў рэчышчы кампрамісу паміж прыхільнікамі Вішнявецкага і Сапегаў. Былі вызначаны пасламі да Міхала Вішнявецкага ваўкавыскі стольнік Юрый Юрэвіч і ваўкавыскі чашнік Юрый Фартунат Калантай [21, k. 97–98; 50, арк. 4–6; 51, k. 89–91]. На рэчыцкім сойміку пад дырэкцыяй рэчыцкага гродскага старосты Казіміра Халецкага пасламі былі абраны рэчыцкі падстолі Аляксандр Уладзіслаў Скарына і Рыгор Юзаф Скарабагаты [52, арк. 765–766 адв.].

Адносна іншых не знойдзеных інструкцый вядома, што ў ашмянскую інструкцыю, згодна з жаданнямі Радзівілаў, быў уключаны пункт аб Кіяўцы і Мялейчыцах [53, k. 47]. Браслаўскі падкаморы Антоній Рудаміна пастараўся, каб пункты, дасланыя каралевічам Якубам Сабескім і Радзівіламі, былі ўключаны ў інструкцыю браслаўскага сойміка [54, k. 7].

**Высновы.** Такім чынам, з 24 пасольскіх інструкцый нам вядомы пункты з 18. Яшчэ ў выпадку мсціслаўскага сойміка, які падзяліўся на два канкуруючыя, мы ведаем некаторыя пункты інструкцыі тых паслоў, выбар якіх быў на канвакацыйным сойме прызнаны за несапраўдны. З вядомых інструкцый шляхта на 13 перадканвакацыйных сойміках выказалася за абранне будучым каралём “пяста”. Як бачна, большасць перадканвакацыйных соймікаў ВКЛ, як і ў Кароне, выказалася на карысць выбару будучым каралём “пяста” і каталіка. Фактычна гэта адкрывала шлях да выбару ў будучым каралём Станіслава Ляшчынскага, які з’яўляўся асноўным кандыдатам “пястам”. Атрымліваецца, што толькі на 5 перадканвакацыйных сойміках шляхта не выказала жадання, каб будучым каралём быў абраны “пяст”. Іншая справа, што сярод іх былі тыя самыя паветы, дзе хутка атрымала перавагу апазіцыя Станіславу Ляшчынскаму – наваградскі і мінскі. Сярод іншых праблем, якія разглядаліся на перадканвакацыйных сойміках і былі ўключаны ў пасольскія інструкцыі, вылучаецца праблема адмены падымнага. Адмяніць гэты падатак у сваіх інструкцыях прасіла лідская, троцкая, гродзенская, ковенская, жмудская, мінская і частка мсціслаўскай шляхты, а брэсцкая шляхта нават даслала ў гэтай справе спецыяльных паслоў да прымаса Тэадора Патоцкага. У інтарэсах магнацкага роду Радзівілаў у пасольскія інструкцыі патрапіў пункт аб вяртанні ім далучаных да Брэсцкай эканоміі ключоў Кіявец і Мялейчыцы. У сваю чаргу па просьбе Тэадора Любамірскага магнаты з Княства пастараліся, каб пункт аб вяртанні капальні солі Кунегунды і кампенсацыі за яе карыстанне Любамірскім і Сангушкам патрапіў у інструкцыі паслам з павятовых соймікаў ВКЛ. Вядома, што каралевіч Якуб Сабескі

не толькі дасылаў просьбу аб кампенсацыі яму даўгоў бацькі караля Яна III Сабескага, але і такім чынам хацеў нагадаць аб сабе як аб магчымым кандыдаце "пястам". Што датычыцца соймікаў ВКЛ, то просьба каралевіча Якуба Сабескага знайшла падтрымку і патрапіла ў інструкцыі віленскай, лідскай, браслаўскай, троцкай, гродзенскай, смаленскай, старадубскай і аршанскай шляхты. Сярод іншых пытанняў, якія часта ўзгадваліся ў інструкцыі паслам з перадканвакацыйных соймікаў ВКЛ, трэба назваць пытанне павелічэння войску і пункт супраць знаходжання дысідэнтаў у войску ВКЛ.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Герье, В. Борьба за польский престол в 1733 году / В. Герье. – М.: В тип. В. Грачева, 1862. – 638 с.
2. Kantecki, K. Po zgonie Augusta II / K. Kantecki // Przewodnik naukowy i literacki.– 1877. – S. 673–688, 767–786, 865–887, 961–989, 1057–1083.
3. Dygdała, J. Kwestia dysydencka w Rzeczypospolitej doby bezkrólewia 1733 roku / J. Dygdała // Zapiski Historyczne. – 1997. – Nr. 62. – Cz. 4. – P. 45–67.
4. Dygdała, J. Antystanisławowska i prosaska publicystyka doby bezkrólewia 1733 roku (dzieła, autorzy, rozpowszechnianie) / J. Dygdała // Kwartalnik Historyczny. – 2002. – Nr. 109.– Zesz. 2. – P. 41–59.
5. Lisek, A. Postawa Radziwiłłów w okresie przedostatniego bezkrólewia i w pierwszych miesiącach wojny domowej (1733–1734) / A. Lisek // Radziwiłłowie. Obrazy literackie. Biografie. Świadectwa historyczne / Pod red. K.Stępnika. – Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2003. – S. 358–370.
6. Szklarska, E. Kwestia wykluczenia cudzoziemca od tronu na sejmie konwokacyjnym 1733 r. / E. Szklarska // Między Zachodem a wschodem. Studia ku czci profesora Jacka Staszewskiego. T. II / Pod red. J. Dumanowskiego, B.Dybasia, K.Mikulskiego, J.Porazinskiego i S.Roszaka. – Toruń, 2003. – S. 561–573.
7. Burba, D. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės pasiuntinių veikla Abiejų Tautų Respublikos seimuose 1733–1736 m. politinio–karinio konflikto metu / D. Burba // Parlamento studijos. – 2006. – Nr. 6. – P. 9–42.
8. Codzienne kłopoty, wielkie interesy i podwójna elekcja ; wyd. Jerzy Dygdała, Warszawa: DiG, 2012. – 226 s.
9. Мацук, А. Пазіцыя магнатаў і шляхты ВКЛ у пачатку бескаралеўя 1733 г. / А. Мацук // Беларус. гіст. часоп. – 2011. – № 7. – С. 3–10.
10. Akta sejmikowe województw poznańskiego i kaliskiego. Lata 1733–1763 ; wyd. M.Zwierzykowski.– Warszawa: DiG, 2015, 985 s.
11. Niedziela, R. Pisma polityczne w okresie bezkrólewia i wojny o tron polski po śmierci Augusta II Mocnego (1733–1736) / R. Niedziela. – Kraków: Historia Iagellonica, 2005. – 364 s.
12. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (LVIA), SA 4748.
13. Lietuvos Mokslų Akademijos biblioteka (LMAB). – F.139. B. 3605.
14. Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD). Archiwum Radziwiłłów (AR). – Dział V. Sygn. 5408.
15. Архив внешней политики Российской империи. – Ф. 79. Оп. 1. 1733 г. Д.17.
16. LVIA. – F. 598. B. 29.
17. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy. – Sygn. 63.
18. LVIA, SA 5957.
19. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1711. Воп. 1. Спр. 24.
20. LVIA. – F. 1282. Op. 1. B. 6106.
21. AGAD. AR. – Dział V. Sygn. 17503. Cz. 5.
22. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy. – Sygn. 49.
23. LVIA, SA 15208.
24. LVIA. – F. 1135. Op. 2. B. 112.
25. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy. – Sygn. 67.
26. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy. – Sygn. 58.
27. Львівська наукова бібліотека ім. В. Стефаника НАН України. – Ф. 103. Оп. 1. Спр. 6571.
28. AGAD. AR. – Dział V. Sygn. 18878.
29. НГАБ. – Ф. 1730. Воп. 1. Спр. 11.
30. Macuk, A. Szlachta województwa nowogródzkiego wobec elekcji Stanisława Leszczyńskiego i Augusta III w 1733 r. / A. Macuk // Przegląd Historyczny. –2005. – Z. 1.– S. 40–60.
31. НГАБ. – Ф. 1737. Воп. 1. Спр. 31.
32. НГАБ. – Ф. 1705. Воп. 1. Спр. 50.
33. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. Т. 4. – Вильно: Тип. Губернского Правления, 1870. – 683 с.
34. Львівська наукова бібліотека ім. В.Стефаника НАН України. – Ф. 103. Оп. 1. Спр. 6570.
35. AGAD. AR. – Dział V. Sygn. 13899. Cz. 9.
36. LMAB. – F. 139. B. 4002.
37. НГАБ. – Ф. 1733. Воп. 1. Спр. 31.
38. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy. – Sygn. 56.
39. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy. – Sygn. 64.

40. AGAD. AR. – Dział V. Sygn. 5557.
41. LMAB. – F. 139. B. 5092. Cz. 2.
42. НГАБ. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 18.
43. Dyariusz życia Ignacego Łopacińskiego // Biblioteka Warszawska, 1855. T. III. – S. 393–425.
44. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy. – Sygn. 53.
45. НГАБ. – Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 10.
46. LMAB. – F. 17. B. 52.
47. Мацук, А. Мазырская шляхта ў час бескаралеўя 1733–1735 гг. / А. Мацук // Гісторыка-археалагічны зборнік. – 2015. – Вып. 30. – С. 75–82.
48. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy. – Sygn. 54.
49. НГАБ. – Ф. 1878. Воп. 1. Спр. 2.
50. НГАБ. – Ф. 1869. Воп. 1. Спр. 2.
51. AGAD. Archiwum Roski. – Sygn. LVIII/14.
52. НГАБ. – Ф. 1736. Воп. 1. Спр. 9.
53. AGAD. AR. – Dział V. Sygn. 2126.
54. AGAD. AR. – Dział V. Sygn. 13425.

## References

1. Ger'e V., Bor'ba za pol'skii prestol v 1733 godu [The Struggle for the Polish Throne in 1733], V tip. Gracheva, Moskow, RU, 1862.
2. Kantecki K., "Po zgonie Augusta II", Przewodnik naukowy i literacki, 1877, pp. 673–688, 767–786, 865–887, 961–989, 1057–1083.
3. Dygdała J., "Kwestia dysydencka w Rzeczypospolitej doby bezkrólewia 1733 roku", Zapiski Historyczne, 1997, no. 62, Cz. 4, pp. 45–67.
4. Dygdała J., "Antystanisławowska i prosaska publicystyka doby bezkrólewia 1733 roku (dzieła, autorzy, rozpowszechnianie)", Kwartalnik Historyczny, 2002, no. 109, zesz. 2, pp. 41–59.
5. Lisek A., "Postawa Radziwiłłów w okresie przedostatniego bezkrólewia i w pierwszych miesiącach wojny domowej (1733-1734)", in Stępnik K. (ed.), Radziwiłłowie. Obrazy literackie. Biografie. Świadectwa historyczne, Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, Lublin, PL, 2003, pp. 358–370.
6. Szklarska E., "Kwestia wykluczenia cudzoziemca od tronu na sejmie konwokacyjnym 1733 r.", in Dumanowski J., Dybasia B., Mikulski K., Porazinski J. and Roszaka S. (ed.), Między Zachodem a wschodem. Studia ku czci profesora Jacka Staszewskiego. T. II, Toruń, PL, 2003, pp. 561–573.
7. Burba D., "Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės pasiuntinių veikla Abiejų Tautų Respublikos seimuose 1733–1736 m. politinio–karinio konflikto metu", Parlamento studijos, 2006, no. 6, pp. 9–42.
8. Codzienne kłopoty, wielkie interesy i podwójna elekcja, wyd. Jerzy Dygdała, DiG, Warszawa, PL, 2012.
9. Matsuk A., "Position of the Noblemen and Szlachta of the Grand Duchy of Lithuania at the Beginning of Interrex Period of 1733", Belaruski Gistarychny Chasopis [Belarusian Historical Journal], 2011, no. 7, pp. 3–10.
10. "Akta sejmikowe województw poznańskiego i kaliskiego", Lata 1733–1763, wyd. M. Zwierzykowski, Warszawa, PL, 2015, pp. 18–19.
11. Niedziela R., Pisma polityczne w okresie bezkrólewia i wojny o tron polski po śmierci Augusta II Mocnego (1733–1736), Kraków, PL, 2005.
12. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (LVIA), SA 4748.
13. Lietuvos Mokslų Akademijos biblioteka (LMAB), F.139, B. 3605.
14. Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD), Archiwum Radziwiłłów (AR), Dział V, Sygn. 5408.
15. Arhiv vneshnej politiki Rosijskoj imperii [Archives of the Russian Empire Foreign Policy], F. 79, Op. 1, 1733 г., D.17.
16. LVIA, F. 598, B. 29.
17. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy, Sygn. 63.
18. LVIA, SA 5957.
19. Natsyianal'ny Gistarychny arkhiŷ Belarusi [National Historical Archives of Belarus] (NGAB), F.1711, Vop.1, Sprava 24.
20. LVIA, F.1282, Op.1, B. 6106.
21. AGAD, AR, Dział V, Sygn. 17503, Cz. 5.
22. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy, Sygn. 49.
23. LVIA, SA 15208.
24. LVIA, F. 1135, Op. 2, B. 112.
25. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy, Sygn. 67.
26. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy, Sygn. 58.
27. L'vivska naukova biblioteka Ukrainy im. V. Stefanika [Lviv National Scientific Library of Ukraine named after Vasyl Stefanyk], F. 103, Op. 1, Sprava 6571.
28. AGAD, AR, Dział V, Sygn. 18878.
29. NGAB, F. 1730, Vop. 1, Sprava 11.
30. Macuk A., "Szlachta województwa nowogródzkiego wobec elekcji Stanisława Leszczyńskiego i Augusta III w 1733 r.", Przegląd Historyczny, 2005, Z.1, pp. 40–60.
31. NGAB, F. 1737, Vop. 1, Sprava 31.

32. NGAB, F. 1705, Vop. 1, Sprava 50.
33. Akty, izdavaemye Vilenskoi arkheograficheskoi komissiei [Acts Published by the Vilnja Archeographical Commission], T. 4, Tip. Gubernskogo Pravlenia, Vilno, RU, 1870.
34. L'vivska naukova biblioteka Ukrainy im. V. Stefanika [Lviv National Scientific Library of Ukraine named after Vasyl Stefanyk], F. 103, Op. 1, Sprava 6570.
35. AGAD, AR, Dział V, Sygn. 13899, Cz. 9.
36. LMAB, F. 139, B. 4002.
37. NGAB, F. 1733, Vop. 1, Sprava 31.
38. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy, Sygn. 56.
39. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy, Sygn. 64.
40. AGAD, AR, Dział V, Sygn. 5557.
41. LMAB, F. 139, B. 5092, Cz. 2.
42. NGAB, F. 1731, Vop. 1, Sprava 18.
43. "Dyariusz życia Ignacego Łopacińskiego", Biblioteka Warszawska, 1855, T. III, pp. 393–425.
44. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy, Sygn. 53.
45. NGAB, F. 1727, Vop. 1, Sprava 10.
46. LMAB, F. 17, B. 52.
47. Macuk A., "Mozyr Gentry during the Interrex Period of 1733–1735", Gistarychna-Arhealagichny Zbornik [Historical and archaeological collection], 2015, Vyp.30, pp.75–82.
48. Archiwum Państwowe w Łodzi, Archiwum Kossowskich z Głogowy, Sygn. 54.
49. NGAB, F. 1878, Vop. 1, Sprava 2.
50. NGAB, F. 1869, Vop. 1, Sprava 2.
51. AGAD, Archiwum Roski, Sygn. LVIII/14.
52. NGAB, F. 1736, Vop. 1, Sprava 9.
53. AGAD, AR, Dział V, Sygn.2126.
54. AGAD, AR, Dział V, Sygn.13425.

## Информация об авторе

*Мацук Андрей Владимирович* – канд. ист. наук. ГНУ «Институт истории НАН Беларуси» (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail : anrzey@tut.by.

## Information about the author

*Matsuk Andrei Vladimirovich*, Ph. D. (Hist.), Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: anrzey@tut.by.

## Для цитирования

Мацук, А. У. Палітычныя пазіцыі перадканвакацыйных соймікаў ВКЛ у 1733 г. / А. У. Мацук // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 2. – С. 41–52.

## For citation

A. V. Matsuk Political Standpoints of the Pre-Convocation Sejmiks in the Grand Duchy of Lithuania in 1733. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2017, no.2, pp. 41–52.